Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ПРАВА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Нявырнятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош. сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту

№ 5 — Вільня, Серада 21-га сьнежня 1927 г. — Год I

Пазагаду Камісара Ураду на м. Вільню сканфіскаваны № 4 „Права Працы“ за перадавіцу „Балячкі нашае вёскі“.

Шахрайства.

Ад нэўнага часу на шпальтах беларускай угадовай прэсы стала друкуецца з нумара ў нумар маніфэст Аб'яднанай Угоды: „Грамадзяне Беларусы! Сяляне і Работнікі!“

Гэты маніфэст зьяўляецца выбарнай дэкляярацыяй аб'яднаных угадоўцаў. Дзеля гэтага лічым неабходным прыгледзецца бліжэй да гэтага шэдэўра ўгадавой выбарнай дэмагогіі.

Што-ж зьяўляецца галоўным гвазьдзем, калі можна гэтак сказаць, гэтай адозвы.

На чым яны думаюць зьбіць сабе выбарны капітал, чым пацягнуць за сабой масы выбаршчыкаў? Банкруцтва пры выбарах у самаўрады паказала ім, на сколькі слабыя ўплывы яны маюць сярод беларускіх працоўных мас. Дык вось для забесьпячэньня сябе ад паўторнага правалу гэтыя паны хапаюцца, як утапаючы за саломінку, за простую кражу, за прысваеньне сабе чужых заслуг, працы і дасягненьняў. Вось што кажуць яны ў гэтай адозьве:

Для прадстаўнікоў у Сойме, якія прайшлі на сьпіску блёку нацыянальных меншасьцяў № 16, аставалася толькі: з аднаго боку дэманстраваць перад Соймам і перад усім сьветам аб гэтых адносінах польскай нацыянальнай большасьці і польскіх уладаў да Беларускага Народу, а з другога *пашыраць нацыянальную і палітычную сьвядомасьць і гэткай дарогай весьці барацьбу за лепшую будучыну свойго народу* (Падкр. намі Рэд.). Ня лёгкая гэта была барацьба.

Але-ж гэтая барацьба, хоць і ня прынесла адразу палёгкі ў цяжкай гаротнай долі нашага працоўнага народу, аднак падгатавала грунт для далейшага змаганьня за правы і інтарэсы Беларускага Народу. Усе мы бачым, як пашырыўся беларускі рух і беларуская сьведамасьць за гэтыя пяць год, і тут мы ня можам не адзначыць, што ў большай часьці сваей гэта ёсьць праца тых паслоў, якіх выслаў Беларускі Народ у польскі Сойм, якія не шкадавалі ні сваіх сілаў, ні сродкаў, ні навет свайго жыцьця ў гэтай барацьбе.

Вось якую працу прарабілі яны. Чуеце, грамадзяне Беларусы, сяляне і работнікі: Гэта яны ўсьведамілі нацыянальна і палітычна дзесяткі і сотні тысяч беларускіх сялян і работнікаў. Гэта яны бстварылі шмат тысячныя арганізацыі беларускіх працоўных мас. Гэта ўсё, як бачыце, зрабіла Беларускае Парляманцкае Прадстаўніцтва, Белар. Пасольскі Клюб на чале з Ярэмічам і Рагуляй, клюб, з якога за ягонную ўгоду выступілі ў сваім часе паслы Грамады. Гэта пад сьцяг ідэалёгіі гэтага Клюбу пайшлі сяляне і работнікі Заходняй Беларусі. Гэта яны (паслы з гэтага Клюбу) не шкадавалі свайго жыцьця ў гэтай барацьбе. Гэта ім разьбівалі галавы фашыстаўскія банды. Запраўды, папера церпяліва, многае сьцерпіць. Але як сьцерпяць гэта беларускія працоўныя масы? Як аднясуцца яны да гэтай яўнай кражы чужога дабра, да гэтай нягоднай спэкуляцыі чужой працай і заслугамі? На гэта адказу гэтым спэкулянтам, адказу і ня двухзначнага, доўга чакаць ня прыдзецца. Гэткім прысваеньнем, гэткай кражай чужых заслуг і працы працоўных мас гэтым спэкулянтам абдурыць ня ўдасца. У гэтым мы пэўны. Палітычная сьпеласьць беларускіх працоўных мас, на якую яны пазываюцца, у гэтым зарука.

„Зьліквідаваньне“ польска-літоўскага канфлікту у Жэнэве.

10-га сьнежня Рада Лігі Нацыяў урэшце апрацавала і прыняла пастанову ў справе зьліквідаваньня польска-літоўскага канфлікту.

Вось у скароце гэта рэзалюцыя Рады.

Прымаючы пад увагу заяву прадстаўніка Літвы, што Літва не знаходзіцца ў стане вайны з Польшчай, а таксама — заяву прадстаўніка Польшчы, што Польшча прызнае ды будзе шанаваць палітычную незалежнасьць і тэрыторыяльную нятыкальнасьць Літвы, Рада Лігі Нацыяў дараджае ўрадам абодвух краёў распачаць у бліжэйшым часе перагаворы — аб устанаўленьні паміж імі добрых стасункаў, ад якіх залежыць мір...

З свайго боку Рада ахвяруе абодвум урадам усялякую дапамогу з боку свайго тэхнічнага пэрсаналу.

У справе скаргі літоўскага ўраду на польскі — за ведамяя „адказныя рэпрэсіі“ проці літоўскіх дзеячоў у Віленшчыне — за дакананыя, як цьвердзіць польскі ўрад, гвалты над польскімі вучыцялямі ў Літве, Рада выбрала дзеля разгляду гэтых скаргаў камісію з 3 сяброў, на чале з самім старшынёй. Камісія прадставіць пасьля справаздачу Радзе. Але, не чакаючы на справаздачу Камісіі, Рада змусіла польскі ўрад — зараз-жа (магчыма) — вярнуць у край усіх высланых з яго літоўскіх дзеячоў(!!!) Апрача таго, у справе пагрозы аружнага канфлікту—Рада дала паўнамоцтвы свайму генаральнаму сэкрэтару — па трэбаваньню аднэй стараны — прымаць патрэбныя меры супакоеньня — у паразуменьні з старшынёй Рады і яе сябром — дакладчыкам.

У канцы Рада заяўляе, што—сутнасьць літоўска-польскага спору яна зусім не закранула ў сваім прысудзе.

З гэтай рэзалюцыі Рады відаць, што Вальдэмарас згадзіўся спыніць „стан вайны“ з Польшчай, які, як ён сам азначыў, зусім ня меў „практычна-палітычнага зьместу, але меў значэньне толькі — праўна-палітычнае“. Гэта значыць, што Літва, зразумела, ня мела ані ахвоты, ані сілы ваяваць з Польшчай, але пакідала толькі быццам — у тым самым „ваенна-крывавым стане“ сваю „віленскую рану“, якую атрымала ад Польшчы ў кастрычніку 1920 г. пасьля адабраньня ад яе Віленшчыны ген. Жэлігоўскім, падчырківаючы гэтым, што яна — не памірылася ані з гэтым аружным захватам, ані з зацьверджаньнем яго Радай Паслоў Антанты. Толькі гэты зьмест і сэнс мела і магло мець „падтрыманьне Літвой стану вайны з Польшчай“...

Але — у канцы рэзалюцыі — Рада заяўляе — пэўне-ж пад рашучым націскам Вальдэмараса, што яна „не ўваходзіць ў польска-літоўскі спор па сутнасьці яго“. Гэта значыць, што Літва, спыняючы „стан вайны“ з Польшчай, не адмаўляецца гэтым ад сваіх прэтэнсіяў на Віленшчыну. А гэтым самым, з другога боку, спыненьне „вайны“ мае толькі слоўнае значэньне.

Праўда, гэтае спыненьне стану вайны адчыняе магчымасьць распачацьця перагавораў аб узнаўленьні добрых стасункаў паміж абодвума краямі, і Вальдэмарас абавязаўся ня ўхіляцца ад гэтых перагавораў!

Але—да таго стану ўзаемнага даверыя, які толькі і можа давясьці перагаворы да пажаданага канца, ад гэтага яшчэ вельмі далёка. Сам Вальдэмарас зараз-жа пасьля прыняцьця рэзалюцыі Радай—заявіў, што — для таго, каб дайсьці да паразуменьня з Польшчай, трэба-ж яшчэ, каб сьпярша неяк зьліквідавалася тое страшэннае напружаньне, якое існуе цяпер...

З свайго боку Польшча абавязалася шанаваць незалежнасьць і нятыкальнасьць Літвы... Гэтым быццам цалком супакоівалася Літва, устрывожаная пагрозамі з боку польскіх палітыкаў і публіцыстаў, а перадусім— супакойваўся сам Вальдэмарас, з сваім фашыстаўскім урадам: бо-ж Польшча тым самым абавязывалася ня прымаць учасьця ні ў якой рыхтаванай літоўскай эміграцыяй акцыі проці ўраду Вальдэмараса... У чым, як ведама, асабліва вінаваціў польскі ўрад Вальдэмарас у Жэнэве...

Гэткім чынам, Рада Лігі можа і запраўды неяк залагодзіла на якісь час вострую пагрозу такога шалёнага ваеннага акту на польска-літоўскай граніцы, але зусім не зьліквідавала гэтай пагрозы наагул—бо перадусім—не спрабавала навет вырашыць па сутнасьці польска-літоўскі спор, пакінуўшы ў ім усё па-старому...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Цікаўная выбарная „плятформа“.

Партыя „прынцыповых пілсудчыкаў“, так-званыя „направячы“, ці „санатары“—пасьля „мазольнай працы“ мазгоў—апрацавалі ўрэшце сваю „выбарную плятформу“, якой каротка, але выразна, ідуць ды клічуць усіх ісьці на выбары — „пад сьцягам ідэалёгіі марш. Пілсудскага“...

Як ведама, сам м. Пілсудскі аб сваей выбарнай „ідэалёгіі“ неяк дагэтуль маўчыць.

Памятаем з часу выбараў 1922 г. вельмі падобная „выбарная плятформа“ была „апрацавана“ беларускімі „зялёна-дубцамі“. Тады „зялёна-дубовыя“ галовы „партыі“ заяўлялі ў сваіх выбарных адозвах і „праграмах“, што „партыя іх — ідзе ў Сойм выпаўняць волю марш. Пілсудскага“...

Назначэньне генаральнага выбарнага камісара.

Распараджэньнем Прэзыдэнта ад дня 13/XII цэнтральным выбарным камісарам назначаны віцэ-міністар справядлівасьці Цар; як паведамляе прэса, урадавец будзе генаральны выбарны камісар у міністэрстве справядлівасьці. У прэсе зьявіліся таксама запярэчаньні чуткам, што Цар у сувязі з сваім назначэньнем адыходзе з займанага сабой раней становішча. Цар зазначыў, што ў міністэрстве застаецца і будзе працаваць надалей над новымі заканадаўчымі праектамі, толькі ня будзе выконываць бягучых спраў і прымаць інтэрэсантаў.

Галоўная выбарная камісія.

У склад галоўнай выбарнай камісіі ўвайшлі прадстаўнікі наступных партыяў:

1) Zw. Ludowo-Narodowy: М. Савіцкі, б. сэнатар В. Беляўскі;
2) Пяст: адв. Урбановіч, б. пас. Осецкі;
3) ППС б. паслы Путак і Лібэрман;
4) Хадэцыя: Кучынскі і Янчэўскі;
5) Жыдоўскае парляманцкае прадстаўніцтва: Гартгляс, Трокенгайт;
6) Stron. Chłopskie: Врона-Рыковскі;
7) Вызваленьне: Багінскі, Шуманьскі;
8) Ch. N. ксёндз Вырэмбовскі, Шадурскі.

Карфанты зрокся кандыдатуры.

На ваяводзкім зьезьдзе хадэцыі аскандалены прыгаворам маршалкоўскага суда Карфанты зрокся кандыдатуры. Гэтае зрачэньне зьезд прыняў маўчаньнем.

Ліст біскупаў.

На арэну выбарнай барацьбы выступілі з пастырскім пасланьнем і айцы духоўныя. Гэты ліст падпісалі ўсе біскупы Польшчы.

У гэтым пасланьні айцы духоўныя заклікаюць да еднасьці ў імя абароны „Родины і Вери“ супраць камуністыч. небясьпекі.

Еднасьць гэта павінна быць пабудавана на „польскасьці“ і „каталіцкасьці“. Вакруг гэтага ліста ўзьнялася сярод правіцы калатніна, як санацыя гэтаксама і буржуазная апазіцыя: хадэцыя, эндэцыя, Пяст ды іншыя стараюцца здыскантаваць гэты вэксэль на сваю карысьць.

Заварушыліся і зубры.

10. XII. адбылося паседжаньне цэнтр. камітэту манархістаў у Варшаве, які вызначыў галоўнага свайго камісара па выбарам былога міністра Велевейскага.

Рэзалюцыі зубраў.

У сувязі з пастырскім пасланьнем Ц. К. Манархістаў прыняло рэзалюцыю, у якой настанаўляе зьвярнуцца да ўсіх груп і партыяў, стоячых на каталіцкім груньце, з мэтай стварэньня супольнага выбарнага фронту і падтрыманьня ўраду, які імкнецца ў мысьль пастырскага пасланьня да аздараўленьня (санацыі) палітычнага жыцьця і ладу ў Польшчы і далейшага разьвіцьця гаспадаркі. Падобныя рэзалюцыі вынесьлі хадэцыя, эндэцыя і інш., толькі з вывадамі процілежнага кірунку ў адносінах да ўраду. Адным словам, кожны талкуе па-свойму.

Францыя рыхтуецца да выбараў.

Да выбараў ува Францыі асталося яшчэ больш, як паўгоду, але ўсе партыі даўно ўжо распачалі падрыхтоўку да выбараў.

Прышлым выбарам прыдаюць вялізарнае значэньне, спадзяючыся амаль ня нейкага „пералому“ ўва ўсей палітыцы Заходняй Эўропы. Спадзяюцца рашучай перамогі левых кірункаў. Асабліва цікаўным пытаньнем дзеля таго ўжо згары зьяўляецца,— куды будуць „ар'ентавацца“ сацыялісты: налева да камуністаў, ці — направа — да радыкалаў.

Як ведама, з свайго боку, радыкалы — на нядаўна адбытным кангрэсе—рашуча пастанавілі, што яны самі ніякага паразуменьня направа не дапускаюць. Але свой прыхільны зварот да сацыялістаў уварункавалі рашучым адмяжаванем сацыялістаў ад камуністаў. Цяпер сацыялісты, з свайго боку, павінны будуць выбраць канчальна, — з кім яны маюць ісьці разам на выбары: з радыкаламі ці з камуністамі. Дагэтуль сацыялісты ўсе неяк выкручываюцца ад рашучага адказу на гэтае пытаньне, на якое ўсе-ж — прыдзе час станоўчага адказу. Усе партыі распачалі вельмі „адказную“ працу — над апрацаваньнем выбарных праграмаў, на якія яны маюць лавіць галасы выбаршчыкаў.

Дык вось, гэтая праграма сацыялістаў сама сабой павінна будзе вырашыць ужо згары, у які бок нахіляюцца сацыялісты: ці ў бок рашучай сацыяльнай палітыкі, ці ў бок кампрамісаў з буржуазіяй.

Гэтым „прабірным пунктам“ праграмы і зьявіўся цяпер ізноў пастаўлены на чаргу дня праект падатку ад капіталаў, проці якога страшэнна абураецца ўся буржуазія, ня выключаючы і „радыкалаў“... Трэба напомніць, што якраз на гэтым баявым пункце ўжо разьбілася лучнасьць радыкалаў з сацыялістамі — пасьля апошніх выбараў, даўшых лявіцы вялізарную большасьць у парляманьце. Дзеля таго, што радыкалы тады адмовіліся ратаваць французскія фінансы прапанаваным сацыялістамі і камуністамі шляхом—частковай канфіскацыі капіталаў, ці—падаткам ад капіталаў, а наадварот—схіліліся да праекту падняць падаткі на спажыўца ды працаўніка, сацыялісты адмовіліся ўвайсьці ў урадавую коаліцыю з радыкаламі, вынікам чаго ў значнай меры зьявіліся і далейшая капітуляцыя радыкалаў перад „нацыянальным блёкам“ правіцы, даўшая да ўраду Пуанкарэ...

Як можа зразумець з апошніх заяваў аднаго з чаловых павадыроў французскага сацыялізму, Блюма (ці — не таксама, як іншыя павадыры—мільянера?), што сацыялісты ізноў стаяць за гэты падатак... Для свае выбарнай тактыкі сацыялісты ўлажылі такую формулу:

„У першым галасаваньні сацыялісты ідуць асобна. У перагаласаваньні (ў разе адсутнасьці абсалютнай большасьці галасоў) сацыялісты аддадуць свае галасы таму кандыдату, які дасьць найбольш гарантыяў таго, што будзе бараніць інтарэсы пралетарыяту“. З гэтага відаць, што сацыялісты — паўсюдых, дзе на другім галасаваньні, (перабалатыроўцы) радыкал будзе канкураваць з нацыяналістам, аддадуць галасы радыкалу, але там, дзе радыкал будзе канкурэнтам камуніста, аддадуць галасы камуністу...

З свайго боку, радыкалы, ня гледзячы на традыцыйны свой лёзунг „ніякага паразуменьня направа“, аднак-жа з свае выбарнай праграмы выключылі ўсялякі ўспамін аб тым, каб „заглядаць у кішані ды прыхода-расходныя кнігі капіталіста“. Рыхтуючы сабе гэтым магчымасьці фактычнага, як цяпер у супольным урадзе Пуанкарэ,—„паразуменьня направа“, ня гледзячы на пастановы кангрэсу...

Што-ж датычыць „нацыянальнага блёку“ (партыі п. Пуанкарэ), дык гэты на выбары рыхтуе больш усяго—„цыфір“, „лічбовую статыстыку“—дрэннай фінансавай гаспадаркі „картэлю лявіцы“, і таго цуду аздараўленьня фінансаў, якога дакаваў Пуанкарэ...

Саюз жыдоўскіх дробных гандляроў проці блёку нацыянальных меншасьцяў.

11/XII адбылося паседжаньне цэнтральнага камітэту саюзу жыдоўскіх дробных ган-

даяроў, які выказаўся супроць блёку нацыянальных меншасьцяў і за стварэньне агульнага жыдоўскага блёку.

Выбарная сітуацыя ў жыдоў.

9. XII. адбылася партыйная рада сіяністычнай арганізацыі Усходняй Галіччыны. На гэтай нарадзе выступаў арганізатар блёку нац. меншасьцяў Грюнбаўм. Місія яго не ўдалася і краёвая арганізацыя Усходняй Галіччыны пастанавіла ў блёк ня йсьці.

Прынятая рэзалюцыя абавязуе да безаглядная партыйнай дысцыпліны ў рамках краёвай арганізацыі. Гэткім чынам жыды ў Галіччыне пойдуць асобна ад блёку. Трэба прызнаць, што гэта пастанова зьяўляецца паважным падрывам блёку ў Усходняй Галіччыне.

Выбарны блёк буржуазнай апазіцыі.

Судзячы па прэсе, ў блёк буржуазнай апазіцыю ўвойдуць наступныя партыі: Хадэцыя, Эндэцыя, Пяст і Narodowa Partyja Robotnicza (правіца). Лявіца N.P.R. ідзе з блёкам санацыі. Ня высьнілася яшчэ, куды прымкне Str. Ch. Narodowe — ці да апазіцыі ці да санацыі.

Чатыры гады катаргі за Мопр.

13. XII. Варшаўскі акружны суд асудзіў Лейзара Ліпшыца на 4 гады „ciężkiego więzienia" за прыналежнасьць да Мопра.

У чэрвені прошлага году ў Ліпшыца ў часе язды ў аўтабусе зроблен быў вобыск і знойдзена кніжыца паквітаваньняў Мопру. На гэтай аснове за нясеньне помачы палітычным вязьням засудзілі Ліпшыца на чатыры гады катаргі. Сваяродныя рэкорды дасягаюцца ў сучаснай Польшчы.

Безработіца ў Польшчы ўсьцяж расьце.

За кароткі час лік безработных павялічыўся, як падаюць весткі з Варшавы, на 36.074 і ўзрос да 178.681.

Узрост дзяржаўных даходаў.

З пачатку бюджэтнага 1927—1928 году гэта знача ад 1-га красавіка 1927 г. да 30 лістапада раўняюцца 14 міліардам 410 мільёнам злотых, або на 328 мільёнаў болей, чым за той-жа час у прошлым годзе.

З падаткаў прыбыла 913.9, або на 223 мільёна болей, чым у мінулым годзе; з манаполя—496 мільёнаў, або на 104.3 мільёна болей, чым у мінулым годзе.

Бязумоўна-ж гэтае павялічаньне даходу лажыцца ў першую чаргу на плечы працоўных масаў.

Заграніцай.

Узнаўленьне камуністычнага руху ў Кітаі.

Тэлеграма з Шанхаю кажа, быццам з з Уладзівастоку выслана 50-тысячная армія ў Кантон, дзе пачынаюць гуртавацца ізноў усе павадыры кітайскіх камуністаў. Быццам у Кантоне насьпявае рэвалюцыя, якая мае мэтай, скінуўшы нацыяналістычны ўрад, ізноў распачаць шырокую акцыю сацыяльнага вызваленьня народу.

Другая тэлеграма кажа, быццам Чанг-Кай-Шэк згадзіўся ізноў стаць на чале нацыянальных арміяў.

Паўстаньне работнікаў у Кантоне.

Урад, выгнаны з Кантону паўстаўшымі работнікамі, зьвярнуўся да ген. Чанг-Фай-Квая, які з значным войскам падыйшоў к Кантону. Распачалася крывавая бітва, у якой лёсы абедзьвюх старонаў хісталіся некалькі разоў. У барацьбе прынялі ўчасьце—пэўне-ж на баку ўрадавых войскаў--англійскія караблі, якія сталі дзеля гэтага абстрэліваць арміяй чырвонага Кантону. У Кантон прыбыў параход з 1500 японскіх камуністаў. Але камандзіры англійскіх караблёў заявілі, што зараз-жа патопяць параход, калі гэты атрад камуністаў высадзіцца на бераг...

Апошняя тэлеграма кажа, што кантонскія рэвалюцыянеры разьбіты і места—у руках урадавай арміі, гэта значыць ізноў пад камандай — чужынцаў. Усё паўстаньне каштавала абедзьвюм старонам — 4.000 жаўнераў.

Камуністычнае паўстаньне ў Кантоне.

Паўстаньне радыкальнай часткі работнікаў у Кантоне скончылася поўным захватам улады ў месьце, адкуль улада новага камуністычнага ўраду перакідаецца плянова на ўсю правінцыю. Чужаземцаў камуністычныя баёўкі не чапаюць, не жадаючы абураць проці паўстаньня іх узмацаваных правоў.

Забастоўка работнікаў у Шанхаі.

Трэба думаць, што шляхам Кантону ізноў пойдзе і Шанхай. Як і ў Кантоне, у Шанхаі распачаліся забастоўкі работнікаў цэлага шэрагу галінаў прамысловасьці. Улады жорстка пакуль-што пасьпешна душаць работніцкі рух.

Трэба думаць, што ізноў пачынае ўздымацца хваля руху, пэўне-ж выкліканая ўзнавіўшайся пасьля перамогі над народным рухам эксплёатацыяй з боку чужаземных прамыслоўцаў.

Па апошніх вестках палажэньне ў Кітаі завастраецца выяўленьнем актыўнасьці правых...

Галасы французскай прэсы аб адбытай канфэрэнцыі Лігі Нацыяў.

Французская прэса выхваляе Лігу Нацыяў, якая адзіная здолела адратаваць мір у Эўропе дый зрабіць новы паважны крок на шляху аздараўленьня Эўропы.

Французскія газэты зьмяшчаюць расказ самога Пілсудскага аб тым, што і як казаў ён на паседжаньні Рады, каб — „прысьпяшыць" яе працу... „Я ня прыехаў у Жэнэву для навуковых распраў над палітычнымі справамі... Я меў зусім ясную мэту: пачуць выразна слова: мір. — Бо-ж бязсумліўна мы мелі на выбар: мір ці вайну... Я хацеў міру ўсёй душой... Дык я сказаў паном у Радзе: „Рабіце мір, паны, а галоўнае — ня трацьце часу, бо ж мне вельмі пільна... Бо-ж мне ня толькі было вельмі пільна вяртацца да Варшавы, але я сьпяшыў і дзеля таго, што сучасны стан рэчаў ня мог больш трываць надалей... Дык усё пайшло вельмі добра... Мушу сьцьвярдзіць, што Францыя была мне вельмі памочная, як зрэшта я і спадзяваўся па ёй... Павінны мы ўсе падзякаваць Брыяну за гэта",..

Дзіва, што Штрэзэман, ратуючы годнасьць і самастойнасьць Рады Лігі, паслаў свой дыплёматычны пратэст яе старшыні, каб той сьцьвярдзіў, што Рада зрабіла сваю працу—„бяз ніякага... націску звонку"..

Галасы літоўскай прэсы.

Найцікаўней даведацца, як думае аб жэнэўскай пастанове прэса самай Літвы: ці яна лічыць Вальдэмараса пераможцам ці пераможаным у Жэнэве.

Ведама-ж, орган ўраду Вальдэмараса, фашыстаўскі „Летувіс" лічыць пастанову Рады рашучай перамогай Літвы.

Перадусім—цяпер больш ня можа быць мовы аб нападзе Польшчы на Літву. Польшча ня можа больш пагражаць незалежнасьці да нятыкальнасьці Літвы.

Гэтым самым спыняецца магчымасьць усялякай дапамогі з боку Польшчы літоўскім эмігрантам — іх акцыі проці літоўскага ўраду. „Калі Плечкайціс не супакоіцца далей, дык будзе ўжо абавязкам польскага ўраду пасадзіць яго ў турму ды выдаць літоўскім уладам" (вось, аб што, здаецца, наўперад ідзе ўраду літоўскіх фашыстаў)... Перамогу „Летувіс" бачыць і ў згодзе Польшчы на паварот выселеных з Віленшчыны літоўцаў, і ў тым, што віленская справа асталася надалей адчыненай. Гэткім чынам сама Рада Лігі скасавала пастанову Рады Паслоў (Антанты) і прызнала, што справа польска-літоўскага спору з-за Вільні—ня вырашана канчальна"...

Наадварот, вельмі востра крытыкуе пастанову Рады орган апазіцыйных людоўцаў. Ён піша, што сумную сутнасьць рэзалюцыі Рады становіць прымус узнаўленьня стасункаў з Польшчай—без звароту Вільні Літве... Як бы ні жадаць міру наагул, але „ўвесь літоўскі народ разумее паразуменьне з Польшчай бяз Вільні, як Гальгота (канец) незалежнасьці Літвы. Бо-ж заваяваньне Вільні было ў плянах польскіх імпэрыялістаў толькі этапам дзеля скасаваньня незалежнасьці Літвы, што якраз прадбача праграма марш. Пілсудскага. „Сьведамы гэтага літоўскі народ у працягу 7 гадоў стойка бараніў сваіх правоў да Вільні, адкрыта пратэстуючы проц захвату свяей сталіцы перад усім культурным сьветам. Дык акт 10 сьнежня (пастанова Рады) зусім не зьяўляецца актам міру... Бо-ж ніхто ня можа ўверыць, што гвалтам накінутыя „добрыя стасункі ня будуць ізноў парарваны"...

Орган хрыстовых - дэмакратаў „Рытас" сьцьвярджае з сумам, што актам 10. XII Літва крута зьмяніла напрамак сваей заграніччнай палітыкі, а гэта — таму, што ў Жэнэве яна пераканалася, што ўсе дзяржавы пакінулі яе... Сярод усіх дзяржаваў, якія заявілі сябе ў Жэнэве „вялікімі міратворцамі", Літва пачулася цалком ізаляванай, навет Штрэзэман, навет Літвінаў пакінулі Літву (Вальдэмараса...) у Жэнэве. Дык палякі цалком перамаглі ў Жэнэве, атрымаўшы скасаваньне стану вайны ды прымус Літве — распачаць перагаворы без звароту Вільні...

Галасы нямецкай прэсы.

Нямецкія дэмакраты і сацыял-дэмакраты вітаюць пастанову Рады — з пункту гледжаньня „кансалідацыі міру ў Эўропе". Нацыяналістычныя газэты лічуць рэзалюцыю Рады „сумліўным вырашэньнем справы" — бо ж „самы вузел спору астаўся не разьвязаным".

Голас польскай прэсы.

Польская прэса наагул вітае, зразумела, пасьпех сваей палітыкі ў Жэнэве.

Англійска-радавыя стасункі.

Справа ўзнаўленьня нармальных стасункаў паміж Англіяй і СССР, здаецца, ізноў робіцца актуальнай.—У Жэнэве Літвінаў меў спатканьне з Чэмбэрленам, але, як заявіў Чэмбэрлен, накуль-што ня высьветліліся падставы для магчымасьці зьмяніць існуючы стан на лепшы. У далейшых гутарках з журналістамі Чэмбэрлен заявіў, што ў часе спатканьня высьветлілася, што як англійскі таксама і радавы ўрады асталіся пры сваіх старых паглядах на ўсе справы, якія дзелюць абодва краі, не даючы ім дайсьці да паразуменьня. Але магчымасьць паразуменьня і новага спатканьня з радавымі дыплематамі—ня выключаны. З свайго боку Англія робіць усё, каб—„вызваліць радавых палітыкаў з пераконаньня, быццам Англія арганізуе коаліцыю дзяржаваў дзеля нападу на СССР".

З другога боку, мы ведаем заявы чаловых радавых палітыкаў, якія таксама лічаць патрэбным перагледзець справы стасунку Англіі і СССР, але слушна лічаць, што Англія, як сарваўшая сама добрыя стасункі, павінна зрабіць пачын іх узнаўленьня.

Сколькі каштавала Англіі Вялікая Вайна.

Вялікая вайна каштавала Англіі—паводле афіцыяльных даных—8 мільярдаў фунтаў, ці 40 мільярдаў даляраў. Змабілізавана было ў працягу 4 гадоў 7 з паловай мільёнаў толькі белых грамадзян Брытанскай Імпэрыі. З іх — 850 тыс. забіта, а 2 мільёны асталіся калекамі на ўсё жыцьцё.

Масавыя мітынгі пратэсту ў англійскай Індыі.

У зьвязку з праектам англійскага ўраду апрацаваць новую „канстытуцыю" для Індыі сіламі назначанай урадам мяшанай — англійска індускай камісіі—адбыліся па ўсяму вялізарнаму прастору Індыі мітынгі пратэсту—проці гэткага складу камісіі. Рэзалюцыі ўсіх мітынгаў дамагаліся перадачы гэтай справы існуючаму ў Індыі парляманту, праўда, таксама, сфальшаванаму англійскай уладай. У зьвязку з гэтым у Індыі пануе сільнае схваляваньне ў народзе, кіраўнікі нацыянальнага руху ў Індыі пагражаюць англійскаму ўраду, — узнаўленьнем байкоту ўсяго англійскага (тавару і г. д.), калі ён ня згодзіцца на трэбаваньні індускага народу.

„Найвышэйшае права" Італіі—на захват Альбаніі.

Дамагаючыся ад „парляманту" (і без таго пакорнага аднаму „дыху" „павадыра"...) ды тлумачучы яму неабходнасьць зацьверджаньня тыранскага трактату з Альбаніяй, Мусоліні—высьветліў—„неразрыўныя вязі — геаграфічныя і... гістарычныя (?), якія лучаць Італію з Альбаніяй у адзінае саюзнае ды прыязнае цэлае"... Дзеля таго—„стасунк паміж абодвума краямі кіраваны... найвышэйшымі законамі, якім павінны бязумоўна падпарадкавацца воля людзей і іх сьляпая палітыка"... Дык італьянскі ўрад (пэўна-ж ведаючы гэтыя „найвышэйшыя законы"...) паразумеўся з урадам альбанскім (створаным, да рэчы сказаўшы, самім Мусоліні...) дый, зьмеркаваўшы ўсе карысьці, якія плывуць саюзу для абедзьвюх старонаў, заключы гэты саюз прыязьні ды ўзаемнай абароны — на выпадак вайны... Ведама, вайны заракацца ня можна, але саюз ды трактат маюць характар „вылучна мірны, дый — найлепш сьведчыць аб станоўчай волі італьянскага народу—загарантаваць — шляхам нятыкальнасьці ды незалежнасьці Альбаніі—бясьпечнасьць Італіі на Адрыятыцкім моры"...

Ведама-ж Італія, як і Польшча адносна Літвы, зусім шчыра заінтарэсавана ў „нятыкальнасьці і незалежнасьці" Альбаніі, толькі хоча, каб яны былі „загарантаваны" вылучна ёй адной—Італіяй...

Узнаўленьне французска-радавых перагавораў.

8-га студзеня распачынаюцца ў Парыжы перагаворы між Францыяй і СССР — у справе заключэньня гаспадарчага дагавору, у справе даўгоў, крэдытаў і г. д.

Парлямант Францыі прыняў бюджэт.

На паседжаньні парляманту прыняты большасьцю 405 галасоў проці 125 бюджэт на 1928 год. Бюджэт прадбачыць выдаткаў— на 42 мільярды 515 мільёнаў зьлішкам франкаў (толькі франк, раўнуючы да даваеннага залатога—спаў у некалькі разоў.

Даходаў налічана з надвышкай над выдаткамі ў 52 міл. 740 тыс. З гэтага відаць, што бюджэт Пуанкарэ ўдалося зрабіць больш, як зраўнаважаным — бо яшчэ з надвышкай.

Ізноў „камуністычныя" авантуры баўгарскага ўраду.

Баўгарскі ўрад, трымаючы ўладу толькі шляхом запраўднага фашыстаўскага тэрору, абапертага на стала тасаванай праваканы ізноў знайшоў у краі „камуністычную змову". Зроблены ізноў масавыя обыскі ды арышты, у выніку якіх разгромлена амаль не цалком „Саюз Незалежных Работнікаў".

Новы ўрад у Эстоніі.

Новы прэм'ер эстонскага ўраду Тэнісон заявіў, што яго ўрад мае зьменшыць лічбу міністэрстваў. Напрамак заграніччнай палітыкі Эстоніі ня зьменіцца.

Урадавы крызіс у Латвіі.

Латвійскі ўрад, не чакаючы на рэзультаты галасаваньня прапазіцыі аб выражэньні яму недаверыя, унесенай апазіцыяй, сам падаў у адстаўку. Урад Скуеніса-Зэленса меў вельмі слабую большасьць у Сойме — часта галасаваньні давалі перавагу толькі ў 1 — 2 галасы. Палажэньне магло сарвацца ў кожны мамэнт. Шмат галасоў адарвала ад ураду—заключэньне трактату з Радамі, які быў ратыфікаваны толькі дзякуючы 6 нямецкім галасам, разьдзяліўшы сойм амаль не на роўныя паловы. Каб скончыць з няпэўнасьцяй, урад, дзе верхаводзілі пераважна сацыялдэмакраты, падаў у адстаўку. Прэзыдэнт Рэспублікі даручыў тварэньне ўраду — павадыру „Сялянскага Саюзу" Альвэрынгу.

Чыгунковы шлях праз палескія балоты.

Польская прэса занепакоена пастановай ураду Белар. Радавай Рэспублікі аб будаваньні вялікага чыгункавага шляху праз палескія балоты — ад Менску да Мазыра. На будову шляху, якая мае быць зроблена ў фарсаваным тэмпе — каб ён быў ужо гатовы на вясну 1928 г., асыгнаваны каля 3 мільён. рублёў. Усе падрыхтаваўчыя працы ўжо зроблены. Будова матывавана даволі зразумелым жаданьнем ураду — зьвязаць багаты лесам, але слаба залюднёны край з цэнтрамі. Але польская прэса б'е трывогу: будуецца стратэгічны шлях—дзеля вайны з Польшчай...

Маленькі фэльетон.

Гісторыя аднаго зьезьду.

Ці ведае хто з вас, браткі, паноў-паслоў (быўшых)—Вэндзягольскага, Галку, Дуброўніка, Адамовіча?

Можа хто ведае, а мо' і ня ведае. Але бадай іх лепшне ня ведаць!

Прыпомніў я іх тут, бачыце, таму, што і да гэтай пары яшчэ не магу ўстрымацца ад сьмеху пры думцы аб адным здарэньні, якое з імі здарылася.

Было гэта так:

Паглядзелі яны на каляндар, бачаць: бяда! — сем дзён толькі да канца Сойму засталося. А там... эх там!... дыэтаў не дадуць, дарэмна ў першай клясе не паедзеш,— трэба ж за нейкую працу брацца.

А праца, ведама, не для іх паноў, гэта—больш мужыцкая справа. Мужык—хам,— затое ён больш рукамі, нагамі, плячамі працуе, а яны — паны — больш жыватом ды галавой.

Сабраліся гэта яны разам, дый давай радзіць, як пры новых выбарах у Сойм пралезьці.

Адзін—стогне, другі—крэкча, трэцьці— вохкае.—Бядуюць паны, што ня ведаюць, як зноў да сялян падлабуніцца.

— Цяпер мужыка не ашукаеш! — кажа (б.) пасол Адамовіч.—Гэта ён добра ведае, бо і сам пяць гадоў назад мужыком быў.

Уздыхнулі цяжка паны.

— Трэба,—кажуць, пераапрануцца ў мужыцкую вопратку, разьехацца па вёсках і пачаць агітаваць. Сяляне павераць, дый зноў у Сойм выберуць.

— Гэта—ідэя! — крычаць паны. Але... як-жа з мовай? Мы пяць гадоў у Сойме з беларускай мовай змагаліся, а цяпер без яе на вёску ані крок! Пачнеш казаць папольску,—пазнаюць сяляне, што пан, пагоняць вон, дый яшчэ па карку дадуць.

Бядуюць паны.

— Трэба, — кажуць, неяк да беларусаў падыйсьці.

— Але да каго?

Прыпомнілі яны казённага „бялорусіна"—Умястоўскага. Пайшлі да яго. А той, ведама, як панам верна служыць:

— Рад старацца!—крычыць.

Пагаварылі паны, падумалі, парадзіліся і рашылі:

„Зьезд аб'яднаных сялянскіх партыяў" у Вільні сазваць.

Дзень назначылі сьвяточны — 27 лістапада, каб перад зьездам у касьцёле за памыснасьць справы памаліцца!

Кажуць навет, што (б.) пасол Галка з нейкім штандарам (сьцягам) у руце перад касьцёлам на вернасьць „справе хлопскай" прысягаў.

Сабраліся паны, а да іх адвакаты Рачкевіч і Абрамовіч прысталі.

Прыехалі і сяляне. Паўнюткая саля была.

Пачалі паны кракадзілавы сьлёзы выліваць. Над сялянскай доляй бядаваць, дый залатыя горы дэкляраваць.

— Ніхто, — кажуць, вам нічога ня дасьць, толькі—мы! Сыплюць абяцанкамі, як з мяшка,—бяры, аж расьпяразвайся! Паны гаворацць папольску.

А сяляне да іх пабеларуску:

— Прэч!

— Далоў!

— Вон!

— Ня будзем старых паслоў выбіраць:— вы ўсе здрайцы, ашуканцы!

— Праўдзівыя нашы абаронцы ў самаходах ня езьдзяць, а за кратамі сядзяць.

— Ціха! Ціха!—ўспакайваюць паны, а сяляне гудзяць, як лес у навальніцу.

Спужаліся паны, ды са злосьці давай сварыцца. Кажуць, што Умястоўскага дэлегат з п. Галкам у прэзыдыюме амаль насы сабе не паразьбівалі, ці чупрыны не павыдзяралі:

Дрэнь справа!—Ня могуць сяляне ніяк з панамі зьяднацца.

Прападае ўся надзея на мандат!

Трэба-ж неяк сітуацыю ратаваць.

Ускочыў тагды адвакат Абрамовіч, прачытаў нейкую карталюшку (і мусіць сам таго ня чуў, што чытаў). На салі шум, гоман, крык. Устаюць з мейсц сяляле гавораць, крычаць, хто як можа. Усё зьлілося ў шумным моры галасоў.

— Расхадзісь!—крычаць паны, а сяляне да іх кулакамі махаюць.

Нехта шустры пабег за сцэну.

А адтуль... чалавек з дзесяць паліцыі з асьпірантам на чале. — Тыя дык хутка ачысьцілі салю.

Разыходзяцца сяляне абураныя, наракаюць:

— Як?—мы за сотні кілямэтраў ехалі, час і грошы трацілі на тое, каб нас тут паны паліцыяй разганялі!...

Разьехаліся па дамах сяляне, як ня солана хлябаўшы.

А назаўтрае паны ў польскіх газэтах:

„Гістарычны зьезд"!

„Аб'яднаньне сялянскіх партыяў ziem Litewsko-Białoruskich"!

І гэтак далей і далей...

А за імі і Умястоўскі ў сваім „Беларускім Дні" паслушна:

— Гаў... гаў... гаў!...

. . . .

Дык вось як паны з „chłopami" (сялянамі) ядналіся, а паліцыя іх разьеднавала!

Сьмешна мне, калі ўздумаю...

А вам?! Бывалы.

Пастановы XV кангрэсу камуністычнай партыі ў Маскве.

XV зьезд усесаюзнай камуністычнай партыі прыняў рад пастановаў, у якіх перадусім — аднагалосна апрабаваў палітыку Цэнтр. Каміт. партыі. Зьезд сцьвярдзіў, што палітыка Камітэту — ня гледзючы на надзвычайна цяжкія абставіны. вядзе ўсьцяж да ўкрапленьня міжнароднага становішча Радавага Саюзу дый усіленьня ролі Радаў, як чыньніка ўсусьветнага міру. Зьезд сцьвярджае далей, што ўнутры краю зроблены паважныя насьпехі на шляху сацыялістычнага будаўніцтва і замацаваньня панаваньня працоўных. Зьезд выражае надзею на тое, што Камітэт усьцяж будзе прадаўжаць далей пляновую палітыку міру. Зьезд лічыць неабходным прадаўжаць далей прамысловае разьвіцьцё краю, асабліва дапамагаючы разьвіцьцю і сельскай гаспадаркі, змагаючыся адначасна з усімі буржуазнымі, кулацкімі элементамі ў краі. У справе апазіцыі зьезд прыняў вельмі рэзкія пастановы, сцьвярдзіўшы, што апазіцыя зусім адарвалася ідэолёгічна ад ленінізма, ператварыўшыся цалком у—„меншавіцкую групу“. Апазіцыя яўна капітулюе перад сіламі ўнутранай і загранічнай буржуазіі. Сцьвярджаючы тое, што разыходжаньні паміж цэнтральнай большасьцяй і апазіцыяй не абмяжаваліся спосабамі партыйнай тактыкі, але захапілі ўжо і праграмы, а галоўнае — тое, што апазіцыйныя групы рашуча перайшлі на бок тых, хто вядзе актыўную барацьбу з Радавай уладай, зьезд пастанавіў — лічыць прыналежнасьць да апазіцыі—нясумесным з быцьцём камун. партыі... Гэткім чынам усе апазіцыянеры аўтаматычна выключаюцца з партыі...

Беларусы у самаурадах знаходзяць ужо самі сябе.

У Клецкай воласьці выбары ў валасную раду прайшлі так, што абсалютную большасьць радных складаюць беларусы. І Паўлюкевіч тут нічога не памог, хоць і стараўся як мага. Ен толькі падліў масла ў агонь барацьбы між раднымі беларусамі і „мясцовымі“ палякамі, бо беларуская люднасьць яшчэ больш яго ненавідзела за яго працу, а радныя Клецкай гміны, адкінуўшы яго здрадвіцкую намову, узяліся за праводжаньня прынцыпу справядлівасьці ў Клецкай гміне. Зразумелая рэч, што на беларускіх землях, дзе жыве беларуская люднасьць, валасныя ўрады і іншыя мусяць быць абсаджаны беларусамі. Дык і клецкія радныя пачалі прытрымоўвацца гэтага справядлівага прынцыпу і замест таго, каб, як хацелі старасты, урадоўцы, асаднікі і т. пад. „мясцовыя палякі“, выбраць у валасны ўрад выстаўленых імі палякоў — выбралі сваіх беларусаў. На старшыню (войта) выбраны быў грамадзянін Дземянюк, на яго заступніка Канона. Зразумелая рэч, што Несьвіжскі староста не зацьвердзіў выбранага валаснога ўраду ў такім складзе і загадаў правясьці выбары нанава. Але гэты загад не напужаў большасьці радных сьвядомых беларусаў, яны зноў выбралі таго самага старшыню і заступніка і толькі на лаўніка замест грам. Таўкача выбралі Тварoўскага.

Гэта страшна абурыла „мясцовых“ палякоў, а разам з імі і абшарніцкую газэту „Słowo“ з 16./XII. г. г., якая пабачыла ў гэтай „дзёрзасьці“ беларускіх радных „akt wyzywający w stosunku do władzy państwowej“. Бо і як-жа гэтыя беларусы, апіраючыся на самаўрадавае і агулам прынятае на ўсім сьвеце права, насьмелі выбраць на войта і на яго заступніка беларусаў, а не палякоў! І зразумела, што як войт, так і яго заступнік зноў аказаліся незацьверджанымі старастай, а на іх месца будуць вызначаны пэўне-ж пажаданыя старасьце і „мясцовай“ польскай люднасьці асобы. І так Клецкія радныя-беларусы не дапялі сваей мэты. Але гэта ня іх віна. Яны выканалі свой абавязак у адносінах да беларускай люднасьці, якая іх выбрала, яны сталі дабівацца зьдзейсьненьня вялікага прынцыпу беларускасьці ўрадоўцаў на беларускіх землях. Дык гэты законны чын іхны годны вялікай увагі і насьледваньня раднымі іншых валасьцеў.

Званы звоняць.

Хто-то моцна б'е ў званы,
Хто-ж то ёсьць? Што за яны?
Чаму звон такі балючы?
Чаму з воч сьлёзы калючы
На пясок сьцякаюць самі?
Хто-ж то тыя званары?
Куды нас завуць яны?
З цёмных вёсак і мястэчак,
Хто-то кліча на палетак
На свабодны, на вясёлы,
Шукаць шчасьця, лепшай долі?
Ці іосьці? Пайдзем!...

Акрадзь Мікуліч.

* * *

Я хачу цябе, сьвет,
Увесь у грузы разьбіць!
Я хачу цябе, сьвет,
Усёй душою любіць.
Я жадаю душой
Па-над зоры сягнуць
І у недры зямлі
Чым глыбей заглянуць.
Хмарай шэрай, імглой—
Усё на сьвеце пакрыць;
Абярнуўшысь зарой,
Усяму сьвету сьвяціць.
Каб я сілу-бы меў
Усё на сьвеце разьбіць,
То тагды я бы сьвет
Мог, як трэба, любіць.

Я хачу цябе, сьвет, увесь у грузы разьбіць,
Аднача сна хачу ўсёй душою любіць.

Слонім-турма, кастрычнік 1927 г. **Саша.**

Наша хроніка.

Спэктакль у Віленскай Беларускай Гімназіі. Тэатральная трупа, арганізаваная пры Галоўнай Управе Т-ва Беларускае Школы над кіраўніцтвам грам. Міхалевіча, пашырае сваю дзейнасьць і надалей. Трупа гэта ўзялася за пастаноўку сур'ёзных п'есаў, ня толькі беларускіх, але і перакладных. Так у суботу 10-га сьнежня была пастаўлена перакладаная з расейскага п'еса Астроўскага, „На парозе справы“. Пастаноўка ўспомненай п'есы была вельмі салідная і вельмі зацікавіла глядзельнікаў, запаўняючых салю гімназіі. Падбор артыстаў, гуляючых у п'есе, быў таксама ўдачны. Побач са старэйшымі артыстычнымі сіламі, як грам. Замэцкі, Міхалевіч і грам. Быхаўцава, даволі ўдала выканалі свае ролі і маладыя віленскія беларускія сілы: Урбановіч, Хвораст, Лукашык, Вера Грыц і інш. Вельмі прыемна, што маладая трупа расьце і разьвіваецца. Здаецца, навет зьбіраецца яна ў часе калядных сьвят пабываць і на правінцыі. Дык трэба толькі вітаць такую думку.

Праводзіны б. вучыцеля Віленскай Беларускай Гімназіі грам. Замарына. Як ведама, з пачаткам гэтага школьнага году віленскія школьныя ўлады, апіраючыся на інфармацыі з польскай дэфэнзывы, выкінулі з Віленскай Беларускай Гімназіі трох вучыцялёў, як „неблаганадзёжных“, у лік якіх увайшоў і грам. Заморын. Але калі бытнасьць грам. Заморына аказалася немагчымай у Віленскай Беларускай Гімназіі, то атрымаў ён запросіны ад Дзьвінскай Белар. Дзяржаўнай Гімназіі ў Латвіі, дзе дыхаецца беларусам лягчэй і дзе ён будзе працаваць і надалей па сваей спэцыяльнасьці. Гэтымі днямі грам. Заморын выехаў ужо ў Латвію. 13-га сьнежня з прычыны яго ад'езду адбыўся ў Віленскай Бел. Гімназіі разьвітальны вечар. Прайшоў гэты вечар вельмі ўрачыста. Сабраўшыяся вучні і вучыцялі ў гарачых прамовах дзякавалі грам. Замарыну за шчырую працу ў гімназіі і выказалі свой сум, што па незалежных ад сабраўшыхся прычынах гімназія мусіць расстацца з дарагім ёй пэдагогам.

„Маланка“. Якраз на першыя дні калядных сьвятаў выйдзе чарговы № 10 часоп. „Маланка“. Дзеля цяжкіх матэрыяльных абставінаў, рэдакцыя часоп. „Маланка“ мусіла спыніць у працягу лета сваю дзейнасьць.

Лічучы на падтрыманьне ўсяго беларускага грамадзянства, рэдакцыя „Маланка“ ад пачатку Новага году пачынае зноў акуратна выпускаць сваю часопісь.

Вітаем і жадаем пасьпеху!

Новыя здабыцьці. Кліч беларускіх культурна-асьветных установаў да радных беларусаў аб дапамозе ім беларускім незаможным вучням—не застаўся пустым. У многіх мясцох на гэты кліч ужо адгукнуліся і пачалі ці то дапамагаць асабіста, ці то дамагацца ад валасных радаў і павятовых соймікаў асыгнаваньня пэўных сум на беларускую асьвету. Так на сходзе Несьвіскага Сойміку было выстаўлена дамаганьне выдаць субсыдыю Беларускай Гімназіі ў м. Клецку. Зразумела, якое ўражаньне гэта дамаганьне зрабіла на сяброў сойміку польскіх патрыётаў, таму нічога дзіўнага, што дамаганьне гэта было адкінена быццам таму, што Соймік наагул ня будзе даваць ніякіх школьных дапамог. Замест вымаганай субсыдыі, было пастаноўлена выдаць 200 зл. на стыпэндыі незаможным вучням Беларускай Гімназіі ў Клецку. Але і гэта здабыцьцё, хоць і малое.

Беларусы-сябры самаўрадаў! Помніце, што дзе-б вы ня былі, вашым абавязкам зьяўляецца дамагацца субсыдыяў на беларускую асьвету на мясцох!

Дык выконвайце-ж гэты абавязак чэсна і шчыра, як сапраўдныя выбранцы Беларускага працоўнага Народу!

Вынікі выбараў у мястовую раду места Беластоку. Перад усім трэба адзначыць, што пры выбарах у Польшчы ўжо сталася звычаем рабіць націск на работніцкія кірункі, як на... „камуністычныя“ і ўневажняць іх. Таму ня будзе дзіўным, што ў такім прамысловым месьце, як Беласток, узялі верх мяшчанска-буржуазныя і буржуазныя партыі, а работніцкая ліста № 14 скрэсьлена.. Але затое зразумелым будзе, чаму на 46.000 грамад., маючых права голасу, прымала ўдзел у выбарах толькі 28.122. Такім чынам 40 прац. (сорак працэнтаў) выбаршчыкаў ня прыймала ўдзелу ў выбарах! З 41 мандату, прыпадаючага на Беласток, 21 мандат атрымалі жыды, 1 м. немцы, 1 „праваслаўныя“ (што гэта за народнасьць такая?) і 18 м. розныя польскія партыі. І ППС-ы тут не пажывіліся, бо атрымалі толькі 3 мандаты (мусіць прайшоў ужо іх „трыумф“!), рэшта-ж 15 мандатаў прыпадаюць на польскую правіцу.

Працэс „19 камуністаў“ у Наваградку ўжо закончыўся. Наваградзкі акружны суд засудзіў 11 падсудных: аднаго на 6 гадоў катаргі, аднаго на 4 гады а рэшта атрымалі па 3 і менш гадоў турмы.

Абвінавачваліся падсудныя ў тым, што арганізавалі ў свой час камуністычныя ячэйкі, а да гэтага, як звычайна, дадалі яшчэ і тое, што займаліся яны шпіёнствам і вялі „выўротовую“ акцыю.

Палітычныя працэсы на нашых землях ня спыняюцца, як бачым. Аж дзіву даешся, няўжо ў польскіх турмах ёсьць яшчэ вольныя месцы?

Справа жонкі б. пасла Баліна. Ёсьць весткі, што абаронца п. Балінавай, якая, як ведама, арыштавана ў Варшаве пасьля таго, як самага п. Баліна знайсьці неўдалося, адв. Чэрніхаў зьвярнуўся да Віленскага акружнага суда з пратэстам з прычыны арышту п. Балінавай, абвінавачанай быццам у шпіёнстве.

З Т-ва Бел. Школы.

Праца гурткоў Т-ва Беларускае Школы

Вялейскім тэатрам 20 кастрычніка с. г. быў наладжаны спэктакль. Гулялі другі раз у Вялейцы „Апошняе Спатканьне“ і „Лекары і лекі“. Чысты даход у суме 70 злот. пашоў на карысьць павадзян у Галіцыі.

Сьвіслацкі гурток шчыра дзякуе ахвярадаўцам, якія зьлажылі ахвяры кнігамі і грашмі на карысьць бібліятэкі-чытальні ў м-ку Сьвіслачы.

Блудзеньскі гурток Пружанскага павету 27 лістапада с. г. наладзіў спэктакль-вечарыну. Пастаўлены былі п'есы: „Міхалка“, „Суд“ і „Зьбянтэжаны Саўка“. Ня гледзячы на перашкоды, якія чыніла гуртку наша дэмаралізаваная інтэлігенцыя, паны ды несьвядомыя нашы браты, спэктакль прашоў надзіва добра.

Лаванскі гурток 27 лістапада с. г. наладзіў спэктакль. Гулялі: „Сурдут і сярмяга“. Даход пашоў на карысьць бібліятэкі-чытальні пры гуртку.

Сенькавіцкі гурток. 4 гэтага сьнежня наладзіў спэктакль вечарыну ў в. Сенькавічы. Гулялі „Суд над Трохпалёўкай“ і „Боты“. На глядзельнікаў асаблівае ўражаньне зрабіла агра-п'еса „Суд над Трохпалёўкай“. Тут сустрэлася ў асобе Нядолі цемра з культурай у асобе Бурака. Гульнёй глядзельнікі былі захоплены. Даход пайшоў на мэты культурна-прасьветныя.

Сьвіслацкі гурток 27-га лістапада г. г. у м. Сьвіслачы наладзіў спэктакль вечарыну. Гулялі „Пан Міністар“. Ня гледзячы на перашкоды тутэйшых здрайцаў працоўнага беларускага люду, якія чамусьці лічаць сябе інтэлігенцыяй, спэктакль прашоў удала. Гэтаму памагла ахвярнасьць усіх аматараўартыстаў. Даход у суме 236 зл. 75 гр. пашоў на незаможных школьнікаў, павадзян і на бібліятэку-чытальню пры гуртку.

Беластоцкая Акружная Управа працуе штодня ад 10 гадз. раніцы да 10 гадз. вечара. Чацьвер і нядзеля ад 10 гадз. раніцы да 5 гадз. вечара. (У часы абедзеныя астаецца ў канцэлярыі дыжурны).

Бібліятэка і чытальня адчынена па аўторках, чацьвяргох і суботах ад 5 гадз. папаўдні да 10 гадз. вечара, а ў нядзелю ад 3 гадз. папаўдні да 10 вечара.

Музыкальны кружок працуе ў нядзелю да 10 гадз. вечара.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Не даюць—а чаму-ж бяруць?

Наша вёска парашыла залажыць бібліятэку, дзеля чаго выпісала кніжак і зьвярнулася да Старосты ў Пружанах за дазволам. У старостве нам сказалі, што дазвол будзе, але паданьне трэба аплаціць гэрбавымі маркамі. Сказана—зроблена. Пацешылі, што дазвол атрымаем цераз два тыдні. Прашло пяць тыдняў і мы атрымалі... адмову. Падстава адмовы—адсутнасьць у вёсцы гуртка Т-ва Белар. Школы.

Паночку, мы дзякуем табе, што ты напомніў нам пра наш грамадзкі абавязак; мы самі ведаем, што гурток Т-ва Белар. Школы нам патрэбен і мы яго арганізуем, але-ж на што было браць гербавы збор, калі вам вядома было наперад, што гуртка ў нас няма і вы дазволу на бібкіятэку не дасьцё. Цікава, чаму гэта ў нас усе прывыклі не даваць, а браць.

Прайдзісьвет.

І асьветы не даюць.

(Горадзеншчына).

20. XI 1927 г. Палаткоўскі Гурток Т-ва Бел. Школы меўся наладзіць спэктакль-вечарыну ў вёсцы Палаткова. За пяць дзён была падана просьба да старасты ў Горадні аб дазволе пастаноўкі спэктаклю-вечарыны ў пустой хаце. Была падана п'еса ў 1 акце „Суд“—У Галубка і дэклямацыя вершаў. Пацешылі нас, што дазвол дадуць цераз паліцыю. Вялікая радасьць ахапіла ўсю ваколіцу, чакаючы гэтага дня, як нібы якога вялікага сьвята. Чулася сярод сялянства, што гэтае захапленьне, гэтае чаканьне перарабіла нашых сялян, нашу моладзь, якія толькі і жылі надзеяй убачыць сваё мясцовае нацыянальнае сьвята. Ня гледзячы на тое, што першы раз нашы маладыя артысты стараліся з вялікай ахвотай вызубрыць п'есу, як найлепей, і прыгатавалі сцэну да адчыненьня спэктаклю, але — дарэмныя былі нашы лятуценьні, дарэмныя радасьці: дазволу нам у апошні дзень не далі. Чаму? Ці-ж нам ўжо нявольна зрабіць няшкоднае маленькае сьвята. Ці-ж камусьці страшна, каб наш сярмяжнік заняўся асьветай? Ці-ж ляпей глядзець, як наша моладзь замест асьветнай працы, будзе займацца п'янствам ды бойкамі, якое здаралася ў нашай моладзі часта? Дык вось, якую мы маем асьвету.

Наздаволены.

Чэсьць і слава!

(З Косаўшчыны).

Не магу ўстрымацца, каб не зьмясьціць на шпальтах нашае газэты ўсяго таго, што мне прышлося пабачыць. У нядзелю 20-га лістапада с.г. я выпадкова папаў у в. Галікі, аж чую там разгаворы, што сёньня тут адбудзецца белар. спэктакль-вечарына, ладжаны агульнымі сіламі вясковае моладзі, пад кіраўніцтвам гуртка Т-ва Бел. Школы, (уваход, канешна, за плату). Думаў ісьці дамоў, але нарашчы ў застацца. Тут я першы раз пачуў на сцэне роднае мне слоўца і быў вельмі задаволены, што першы раз ставяць, а так добра выходзе. Гралі: твор „Дрыгва“ і камэдыю „Зьбянтэжаны Саўка“. Вечар прайшоў вельмі карысна і прыемна, а дзеля гэтага лічу сваім абавязкам сказаць: Чэсьць і слава Вам—сейбітам свайго роднага слова! Няхай ваш паступак збудзіць тыя гушчы, што яшчэ дагэтуль сьпяць. А Вы, маладыя артысты, артысткі-аматары і ўся моладзь в. Галікі, на вашых тварах гараць яскравыя доказы таго, што Вы здольны весьці культ.-асьветную працу, як найлепей, а дзеля гэтага больш энэргіі. Больш працы!

Няхай б'юць праменьні сонца і ў наша—Беларускае ваконца! **Пералётны**

Ці не акадэмія навук у вёсцы?

(Вёска Вострава, Старавейскае воласьці, Слонімскага павету).

Ёсьць у нашай вёсцы рассаднік польскасьці, гэта — школа. Прыслалі вучыцельку ажно з Пазнані. Пакуль напісала паведамленьні бацькам аб высылцы дзяцей у школу, прайшоў пэўны час. Пасьля прыехалі да яе госьці, дык каля 3-х тыдняў толькі гулялі. Госьці паехалі, трэ' было вучыць, але распачалі рамонт школы, — абы ня вучыць. Нарэшце распачала „навуку“. За той час, што вучыцелька спацыравала з гасьцямі дый рамантавалі школу, дык аштрафавана каля 50 дзяцей па 3 зл. і вядома з усіх паспаганялі штраф пры дапамове экзэкутараў. Калі-ж адзін з бацькоў паехаў у Слонім да Інспэктара, каб зьняў штраф, дык Інспэктар адказаў, „што ні пад якім варункам ня можна, — мусіш заплаціць“. Селянін кажа, „я не павінен быць аштрафаваны, бо пан уняважніў маю дэклярацыю—таму, што ня ў школьным веку мой хлапец“, гэта пана Інспэктара відаць ня тычыцца. Каб што-небудзь сказаць, ён „пацешыў“: „Чаго-ж вам трэ', ужо-ж і беларускую школу маеце, з 1-XII г. г. будзе новы вучыцель дый вучыць пабеларуску“.

Пане Інспэктару, няўжо-ж Вы лічыце нашага селяніна такім дурным, як Вы ёсьць разумны. Сяляне ведаюць, што утраквістычная школа — гэта не беларуская школа, а карыкатура на яе. Сорам Вам гэткім чынам весьці барацьбу супроць беларускае школы! З дэклярацыяў на 62 дзяцей прызналі важнымі толькі 36, а ў школьным веку ў вёсцы ёсьць звыш 120 беларускіх дзетак і для іх ня можа быць адчынена чыста беларуская школа? Чаму гэта? Вучыцелька прымушвае дзяцей гаварыць польскую малітву, — дзеці ня хочуць. Поп наш Барыс Кірык, што вучыць дзяцей закону Божага, дык яму вучні скардзяцца на гэта, а ён радзіць — слухаць вучыцельку й гаварыць тую малітву, якую іх вучыць. Добры палянафіл. Калі толькі прыходзіць на лекцыі, дык ня вучыць, што трэ', а палову часу аддае — просьбе і тлумачэньню, каб дзеці куплялі ў яго крыжыкі па 50 гр. Але-ж да гэтага часу, здаецца, ніводнага не прадаў. Закону Божага вучыць дзяцей парасейску, малітвы па-царкоўна-славянску, выкладовая мова — польская, беларуская „jako przedmiot“ па гадзіне цераз два дні на тыдзень... у астатніх 3-х аддзелах, бо ў першым толькі польская. Вось — на 4-х мовах у пачатковых школах вучаць беларускіх дзетак! Дачакаліся лепшае будучыні, — гэта-ж можна падумаць, што адчынены філёлёгічны факультэт, ці акадэмія навук. Але якую веду нашы дзеткі выносяць з гэтае „Акадэміі“, ці з гэнае мешаніны? Браточкі, са сьлязамі на вачох і з болем у сэрцы кажу: Ніякае!... Выходзяць поўнымі анальфабэтамі. Каму гэта патрэбна трымаць нашых дзетак у цемры — дык ня ведаю!

Хай тыя стогны і енкі бацькоў, сумуючых аб далейшым лёсе сваіх нявінных дзетак, упадуць на галаву і сумленьне тых, па чыей віне застаюцца яны цёмнымі.

„Сэлэтэ.

Каму жаліцца.

У ноч з 1-га на 2-ое кастрычніка с. г. у в. Хаценчыцы былі параклейваны процідзяржаўныя адозвы. Дзеля таго, што адозвы былі прыклеены ў тым месцы, дзе дзяжурыла паліцыя і навет, як кажуць, на дзьвярох

пастарунку, дык паліцыя стала „на дыбы“. Пашлі вобыскі, у выніку якіх арыштавалі двох, у тым ліку і майго 17-ці гадовага сына Аляксандра Сташкевіча. Падставай арышту паслужылі шлюскаўкі (кнопкі), якія былі знойдзены ў мяне і якія аказаліся падобнымі да тых, што былі прыбіты адозвы.

Ня гледзячы на тое, што я ўдаводніла, што сын мой у тую ноч з 1-га на 2-ое кастрычніка быў на начлезе і нікуды не адлучаўся, а кнопкі ў мяне, як уласьніцы склепу, могуць быць розныя, справе сына не памагло.

„Арыштанты“ сядзяць і гінуць у Вялейскім вастрозе, куды ня пускаюць навет бацькоў пабачыцца з „найвялікшымі праступнікамі“, абвінавачваць якіх у гэтым праступку ёсьць менш падставы, чым тых, хто іх абвінавачвае.

Пісала да сьледаваценя, пракурора, але-ж ці ім галава баліць, што гінуць нявінныя людзі.

Каму жаліцца?—Вам, паважаныя чытачы, бо вы лепш усіх сытых адчуеце гора мацярынскага сэрца.

Ольга Сташкевіч.

Каму няма лесу — селяніну.

(Слонімшчына).

Пасьля імпэрыялістычнае бойкі, якая адыгрывалася ў нашай старонцы, хаця і прайшло 7 гадоў, але раны, зроблены ею нашаму гаротнаму брату селяніну, й па сёньня не загаіліся. Колькі было зьнішчана сялянскіх будынкаў, якія й да гэнага часу ня ўсе адбудаваны?! Лесу ня тое, што каб ня было, на адбудову, — не! — ёсьць яго досыць, і што год купцы-жываеды страшэнна яго нішчаць з нейкай дзікай пасьпешнасьцю. За купцамі селяніну ня можна купіць дрэва ня толькі на хату, але і на апал. Вось, кастлявая рука нядолі, а часта голад й холад й па сёньня ня выходзіць з-над сялянскае страхі. 12 XI-27 г. прайшла нашым краем стыхійная катастрофа, якая яшчэ больш падбавіла гора ў нашае жыцьцё. Вураган зьнішчыў цэлыя вёскі, а іншыя часткова зачапіў, а лесу дык вялікія абшары паложана. Цяпер, хоць будзе дзе лесу купіць танней — думае селянін, бо тыя гады сырога лесу сялянам ні пад якім чынам не прадавалі, толькі выбіралі сухастой ці апаўшы, паўгнілы, купцу ня годны. Паміж вёскамі Вострава, Сельжы, Лупачы, Тумашы і іншыя ў Слонімскім павеце, лесу выламана бурай каля 130 гэктараў. Уся ваколіца думала, мо' хоць тут прададуць танней. Але ня тут то было! Увесь гэны буралом закупілі ўжо жываеды-купцы Лідзкі, Фальман і Мэйяровіч. Усеміласьцівейша дазволена купляць гальлё па 1 злоту ад воза, бо купцу гэта не патрэбна.

У гэтых лясных работах купцы страшэнна вызыскуюць сялян. За мэтр дроў паставіць плацяць 2 зл. 50 гр., падвойны — 4 зл. Калі ад цёмна да цёмна працаваць, дык ледзьве заробіш 3—4 зл., з канём ня больш — 6 зл. Зароблены грошы па месяцу й больш не выдаюць. З тае прычыны, што ваколічныя вёскі надта бедныя, а заробкаў лепшых няма, дык сяляне й на гэты жабрацкі зарабатак накінуліся. Жываеды-купцы аж рукі паціраюць ад радасьці, што экспляатацыя ўдаецца як найлепей і іх машна разбухае з нашае крывавае працы. А наш брат і надалей ўсё ходзіць працаваць за гэты жабрацкі зарабатак!

З вялікім жахам і болем у сэрцы глядзімо, як наша багацьце — лясы — таюць, як вясеньні сьнег. Ад зімы да зімы рака ўся пакрыта плытамі. Дзе былі векавыя лясы, дык цяпер толькі сталі трасьнякі якія толькі жаласна шумяць а былай сваей велічы.

Гмінныя рады, ці не на вас ляжаць абавязак дабіцца таннае прадажы лесу для сялян і хоць часткова спыненьня дзікага зьнішчэньня нашага багацьця — лясоў?

Працуючы ў лесе.

Змаганьне з цемрай.

Урад Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Канюшоўшчыне Баранавіцкага павету ў паразуменьні з Драматычнай Сэкцыяй Цырынскага Гуртка ў сёлетнім годзе арганізаваў у м-ку Гарадышча некалькі спэктакляў. Былі адыграны наступныя п'есы: — 12 чэрвеня „Птушка Шчасьця“ і „Суд“, 2 ліпня—„Страхі Жыцьця“ і „Модны Шляхцюк“, 30 кастрычніка—„Паўлінка“. На кожным спэктаклі поўная саля глядзельнікаў вітала нашых артыстаў з энтузіязмам. Тут варта адзначыць адно характэрнае зьявішча, якое здарылася 29—30 кастрычніка, падчас гульні „Паўлінкі“. Справа ў тым, што адначасна атрымалі дазвол ад Баранавіцкага старосты наш Гурток Т-ва Беларускае Школы і „Kółko Młodzieży“ з Ворончы (на дзень 29 кастрычніка). „Kółko Młodzieży“ ставіла п'есу 'Ojcowizna“. Дык вось са згоды Камэнданта паліцыі м-ка Гарадышча рашылі гэтак: „Kółko Młodzieży“ адыграе 29 кастр., а Гурток Т-ва Бел. Школы 30 кастрычніка. Добра! Дзякуй за гэта. На салі падчас польскага спэктаклю можна было заўважыць усю мясцовую інтэлігенцыю і ўрадоўцаў. Але нешта, як спэктакль падыходзіў да канца, дык сярод глядзельнікаў чуваць было агульнае незадаволеньне гульнёю. Натуральна, што пасьля гэтага, назаўтра, на беларускі спэктакль ужо шмат хто з інтэлігенцыі не пайшоў. Ма быць думалі, што „лапатнікі“ лепей ня згуляюць. Але нашы артысты даказалі іх памылку. „Паўлінка“ адыграна была вельмі добра, аб чым сьведчыла цэлая бура воплескаў, якая нясласся з салі глядзельнікаў. Артыстаў выклікалі на „bis“.

Шчырае Вам дзякуй, дарагія барацьбіты з цемрай! Хай з кожным днём мацнее і ўзрастае Ваша духовая сіла і энэргія! Ідзіце дружна, не шкадуючы сваіх ахвярных высілкаў на той шлях, які завядзе наш многапакутны Беларускі Народ у сям'ю культурных народаў. Будуйце Беларускую Культуру!

С. Бу—кі.

Пагоня за мандатамі.

(З Слонімшчыны).

Надыходзяць выбары ў новы Сойм і Сэнат. Каб набыць мовыя мандацікі, панкі банкетуюць, а часамі заглядваюць і і да нас, каб для мандацікаў падрыхтаваць грунт.

Гутарка тут ідзе аб Слонімшчыне, куды перш гэтыя панкі неяк мала заглядвалі. Праўда, агітуючы за 16-ку ў 1922 г. фігуру Ярэміча (таму не такую яшчэ слупую) бачылі ў нашым кутку. Потым, яшчэ пры цэласьці Беларускага Пасольскага Клюбу заглянуў у Чамяры п. Рагуля. Па падзелу Клюбу п. Рагуля праездам у Наваградчыну (ужо не ў лапцёх) „шчасьлівіў“ ваколіцу Дзярэчына сваім візытам. У гутарцы з знаёмымі ён абураўся на аўтара артыкулу „Перш блін комам“, зьмешчаны, здаецца, у № 2 „Беларускае Нівы“. Абурэньне яго перашло навет у пагрозу выззваць аўтара на літэратурную дуэль. Але-ж, як вядома нам, дуэлі панок Рагуля спалохаўся, а ўжыў іншы мэтад змаганьня са сваімі ворагамі: пасадзіў іх на нейкі час за краты, дзе яны ня будуць ні Яроміу ні Рагулі і ні іншым „благадзецелям“ працоўнага беларускага люду шкодны.

Цяпер Рагуля раптам зьявіўся зноў у нас, але на гэты час з золатым у кішэні. Абяцаючы золатыя горы ўсім (турмой цяпер ня страшыць), хто пойдзе з ім, ён заклікае нас падтрымаць іхнюю цёплую кумпанію.

Паночкі! Няўжо-ж вы думаеце за сваё золата ў нас знайсьці Юдаў?

Прэч, прадажнікі! Наша Слонімшчына чыстая і не сьмярдзіць Сельсаюзьніцка-Хадэцкім брудам. Туды вам дарога, куды паказана Умястоўшчыне з Паўлюкевічам.

Яшчэ раз — прэч, нячыстыя рукі, запэцканыя кроўю беларускага працоўнага люду, ад Слонімшчыны!

Бурачок — белы.

Перашкаджаюць культ.-працы.

Шмат разоў прыходзіцца чуць ад наўсьвядомае палітычна беларускае інтэлігенцыі у нас на правінцыі, што: нашая газэта „Права Працы“ асабліва ў апошнія часы шмат месца ўдзяляе грызьні з рознымі беларускімі групамі, і што зьявішча гэтае прыкрае і непажаданае і лепш было-б, каб пісалі чаго навучальнага.

Пэўна-ж не карысна запаўняць шпальты нашае паважанае часопісі імянамі гэтакіх малойчыкаў, як: Паўлюкевіч, Умястоўскі, Ярэміч і розных там яшчэ польска-панскіх падмыванцаў, замест таго, каб пісаць артыкулы літэратурнага ці то грамадзка-выхаваўчага зьместу, прыходзіцца абараняцца самой часопісі ад розных брудных вымыслаў, а так-жа ахоўваць нашае мала-сьвядомае беларускае працоўнае грамадзянства ад вышэй памянёных „гэрштаў“, якія, чуючы прадвыбарную кампанію ў Сойм, жыруюць на мандаты. Адным ня хочацца згубіць, другім хочацца дабыць больш мандатаў.

І вось уся гэтая, „гоп-кампанія на панскіх чаёх“ усялякімі спосабамі (як ведзьма), перакоўваюць языкі з панскага на беларускі. Вызваленьне і Стронькіцтво Хлопске стараюцца абаламуціць нашае працоўнае сялянства і коштам яго несьвядомасьці дабыць сабе мандацікаў (смакуюць ім гэтыя мандацікі), дык яны ўсьцяж робяць проста бандыцкія напады і беспадстаўныя закіды кіраўніком нашае пав. часапісі, чым зьмяншаюць прадукцыйнасьць культурнае працы. Мы, правінцыянальная інтэлігенцыя, павінны добра разумець, а так-жа растлумачыць менш сьвядомым усё гэта і цьвёрда верыць, у шчырае жаданьне нашае паважанае часопісі усьцерагчы нас ад усяе гэтае хэўры, „закінутай к нам па волі рока на лоўлю шчасьця і чыноў“.

Міхась Дым.

Пісьмы у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Прашу не адмовіць надрукаваць у Вашай газэце, „Права Працы“—наступнае:

У газэце „Сялянская Ніва“ ад 3./XII. г. г. быў надрукаваны мой ліст на імя Пасольскага Клюбу, у якім я выказаў свой погляд на выбары, як роўна сканстатаваў факт адносін да мяне паслоў Клюбу, з якімі я, як з калегамі па працы Соймавай—нажаганаўся. Адыходзячы ад палітычнага жыцьця, дзякуючы скуткам прыгавору цяжкае турмы, і лічучыся з фактам падзелу на групы жыцьця беларускага і таго антаганізму, якога ня было, калі я сядзеў у турме і, бяручы пад увагу найлепшыя адносіны да мяне розных груп ці асоб з той ці іншае групы, якое выражалася ў маральным ці навет матар'яльным падтрыманьні мяне, як у турме, так у роўнай меры і па выхадзе з турмы, я прыношу ўсім гэтым асобам ці арганізацыям найглыбейшую падзяку.

І ўсім ім кажу—дзякуй і не памінайце ліхам.

Пастольки, паскольку сучасны стан мой дазволіць быць карысным для беларускай справы — заўсёды гатоў служыць свайму народу.

З пашанай

С. Баран—б. пасол.

Горадня, 5./XII. 1927 г.

Яшчэ ў справе „самазванства“ пана Ф. Умястоўскага, як рэдактара і выдаўца „Нашае Долі“.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Зьвяртаюцца да мяне людзі з просьбаю, каб я высказаўся, хто быў фактычна выдаўцом ды рэдактарам у 1906 годзе „Нашае Долі“.

Вядома мне напэўна, што першым выдаўцом „Нашае Долі“ быў Тукеркес, які мне гэта сам гаварыў, што даў патрэбныя на выдаваньне газэты грошы. Затым пасьля першых трох нумароў выдаўцом стаў Іван Луцкевіч. Што да рэдактарства—дык усе падпісаныя на нумарох газэты рэдактары, былі рэдактарамі толькі „дзеля адседкі“, фактычна-ж газэта мела заўсёды рэдактарства кальлегіяльнае.

У маіх рукапісных „успамінах“, якія вяду ад 1903 году, аб якіх-колечы „заслугах“ пана Ф. Умястоўскага ў кірунку ці выдаваньня ці рэдактарства „Нашае Долі“—няма нічога. Выдаўцамі ды кіраўнікамі „Нашае Долі“ ў 1906 годзе я вельмі цікавіўся, апавяданьні іх запісваў і ў маіх успамінах, гісторыя паўстаньня і выдаваньня гэтае першае грамадзянскае газэты апісана досіць падрабязна.

Аб рэдактарстве пана Ф. Умястоўскага „Нашае Долі“ ды аб яго выдаваньні гэтае газэты праз 21 гадоў ні ад каго ніколі ня чуў нічога!

Думаю, што аканчальныя, бо дакумэнтальныя доказы маіх слоў могуць даць яшчэ судовыя, паліцэйскія ды жандармскія архіўныя дакумэнты, якія цяпер, як датычна асобы пана Ф. Умястоўскага так і датычна „Нашае Долі“, студыюе ў Менску грамадзянін А. Шлюбскі, каторы пэўне і апавесьціць іх у друку, як гэта ўжо зрабіў часткова ў месячніку „Полымя“.

З вялікаю пашанаю да Вас

інж. Р. Земкевіч.

Варшава,
12./XII. 1927 г.

Ад Рэдакцыі. Рэдакцыя ахвотна зьмяшчае гэты ліст вядомага беларускага археолёга і гісторыяграфа, у праўдзівасьці доказаў якога мы ня можам сумлявацца. Хай-жа праз гэты ліст беларускае грамадзянства ў найлепшы спосаб даведаецца, наскольки заправды спэкулюе п. Умястоўскі сваім, як аказваецца, самазванным рэдактарствам першай беларускай рэвалюцыйнай газэты і зьвязаным нібы з гэтым орэолем першых змагароў за вызваленьне беларускіх працоўных масаў.

Паштовая скрынка.

Прайдзісьвету. Шмат яшчэ ёсьць на нашай Бацькаўшчыне падобных да вашых Мікалаеўскіх хлапцоў, якія замест кніжкі лепш заглядваюць у бутэльку, а потым працуюць з нажамі. Трэба з гэтым злом змагацца ўсім, хто чуе сябе сьвядомым селянінам, хто балее сэрцам, бачучы дзікія праявы нашых несьвядомых братоў. Працуйце, дарагі сябра! Ваша праца ўсё-ж такі перамoжа нарэшце гэтае зло. **А. Бальцэвічу.** Што вашы хлопцы чытаюць „Biel. Krynicu“, „Сялянскую Ніву“ і „Беларускі Дзень“ — гэта яшчэ не вялікае зло. Чытаючы, хаця і гэткія газэткі, чытач хутка даведаецца, куды яны імкнуцца, а даведаўшыся, што пішуць і думаюць ворагі працоўнага люду, лягчэй будзе нам з імі змагацца. Што ваша вёска не працуе на культурнай ніве, гэта дрэнна, але трэба спадзявацца, што і вы будзеце захоплены агульным рухам адраджэньня. На гэта прыйдзе час, які ўжо не за гарамі. **Е. Мінітчуку.** Чакайце адказу на ваша пытаньне ў наступных нумарох "Права Працы".— **Гр. Язэпу Пабедзінскаму.** Вымаганьне ад сяброў Беларускага Банку і яго аддзелаў прадстаўленьня гмінных пасьведчаньняў аб стане гаспадаркі і ўласнаручных подпісаў іх самых, а так-жа іх паручыцеляў ня ёсьць „самадумнае“ каго небудзь з служачых Банку, паасобных сяброў Управы, або Наглядная Рады, а дзеля ўзмацаваньня стану Банку і забясьпечаньня яго ад магчымых страт, абаперта на сумеснай пастанове аб гэтым Наглядная Рады і Управы і прызнана карысным для Банку „Rewidentem Rady Spółdzielczej Głównej“. Што датычыць сцьверджаньня праз гміну, або натарыуса знака няпісьменства няпісьменых сяброў і паручыцеляў на вэксалях — дык гэта вымагаецца, як агульным правам аб вэксалёх, так і выплывае з артыкулу 18 „Ustawy o Spółdzielniach“. — **Я. Сідаркевічу.** З Вашых вершаў памагчымасьці скарыстаем.— **Платону Грышкевічу.** У Вашых вершах—добрыя думкі, але слабыя вобразы. — **Асьцюку.** Вашы вершы з часам будуць выкарыстаны. Пішэце.—**Алесю Ц. і Ас—ч.** Вашы вершы будуць зьмешчаны ў наступным нумары. — **П. Алейніку ў Буэнос Айрэсе** (Бразілія). Вашу карэспандэнцыю аб гібелі параходу „Мафальда“ дасталі. Вы прывялі паважныя доказы віноўнасьці параходнае кампаніі ў гібелі больш паўтысячы людзей. Так—буржуазія— і там як і ў нас—зусім ня лічыцца з гібельлю нашых братоў—працоўных. Самую карэспандэнцыю, з прычыны ле вялікага разьмеру, ня можам зьмясьціць. Пішэце аб найбольш яскравых мамэнтах эксплёатацыі працоўных, а асабліва аб жыцьці выхадцаў з беларускае вёскі, якіх ёсьць там нямала.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрые разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Усячына.

Вялізарны мэтэор.

У Тунгускай тундры на Сібіры ўпаў нядаўна вялічэзны мэтэор (камень... „упаўшы з неба“), для дасьледаваньня якога нядаўна езьдзіла савецкая навуковая экспэдыцыя.

На абшары дзесяці тысяч квадратных кілёмэтраў паверхня ўся парыта асколкамі мэтэору, каторы спаў на зямлю дажджом. Вялікшыя часткі, каля 70 аршын у папярэчніку, урыліся ў зямлю на 2—3 мэтры. Расплаўленыя асколкі запалілі лес на вялікім абшары, а бура, якая ўзьнялася пры паданьні каменя, паваліла некалькі тысяч дрэваў.

Лічбы, як з байкі.

Німаверныя сумы каштавала сусьветная вайна. Сябра амэрыканскага парляманту Віктар Бэргэр аблічыў, што ўся гэта рэзьня каштавала больш 400 мільярдаў даляраў.

Бэргэр кажа, што за гэтыя грошы можна было для кожнай сям'і ў Амэрыцы, б. Расеі, Францыі, Англіі, Нямеччыне, Бэльгіі, Канадзе, Аўстрыі—пабудаваць дом, вартасьці 2500 даляраў, дый яшчэ з інвэнтарам і гародам.

Апрача такога каштоўнага падарунку, засталося б яшчэ столькі грошай, што ў амаль усіх местах успомненых дзяржаваў можна пабудаваць школаў на 10 мільёнаў і бібліятэкаў на 5 мільёнаў.

Але гэта яшчэ ня ўсё. Па выкананьні ўсіх гэтых дабрадзействаў з гэтых 400 мільярдаў даляраў, засталася-б яшчэ столькі грошай, што можна было-б за іх купіць усю Францыю і Бэльгію з усім, што ў іх ёсьць каштаўнейшае.

Бо ці лёгка сабе прадставіць, што гэта ёсьць — 400 мільярдаў даляраў.

Гэта-ж, калі ператапіць гэтую суму на штабы чыстага золата, важыла-б яно каля 800 міліёнаў кілёграмаў. Дзеля перавозкі гэтага цяжару спатрэбілася-б 80 тысячаў вагонаў, або 1,600 таварных цягнікоў па 50 вагонаў кожны.

Столькі выдалі цары ! каралі на то каб забіць мільёны людзей, каб парабіць дзесяткі мільёнаў калек і сотням мільёнаў людзей прынясьці бяду і бадзяньне па сьвеце. За гэта ім і дасталося: кулем паляцелі са сваіх прастолаў раз на заўсёды..

Дык вось, якія кветкі буржуазнай „цывілізацыі і культуры“!

Характэрны кандыдат у каты.

У Празе толькі што абвешчаны... конкурс на становішча ката. Стары кат — выслужыў свае дый выйшаў у адстаўку. Дык— сярод 59 паданых прашэньняў ёсьць—аднэй кабеты, аднаго ўрадоўца, адно адстаўнога актора і адно—прафэсара Багаслоўя...

У Польшчы казённы кат зьяўляецца... доктарам мэдыцыны. Ужо гэта — зусім паважна... Але Чэха-Славакія дык пераганіць Польшчу, калі возьме катам дзяржаўным доктара Багаслоўя...

Рэдактар-Выдавец: А. Выдрыцкі.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.